# ІНТАНАЦЫЯ – НЕВЕРБАЛЬНЫ СРОДАК СТВАРЭННЯ ЭМАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ У П'ЕСАХ А. МАКАЁНКА І А. ДУДАРАВА

**А.Г. Свяцілава**

А. Макаёнак і А. Дудараў – "настаўнік" і "вучань" – гэта драматургі, якія дасягнулі значнай вышыні ў галіне буларускай драмы. Кожны іх твор – гэта востры канфлікт, шырокая праблематыка, непаўторныя вобразы і супярэчлівыя характары. Добра ведаючы тую адметнасць драмы ад іншых твораў літаратуры, згодна якой рэалізацыя характараў адбываецца праз дыялогі паміж героямі, гэтыя аўтары ў кожную рэпліку персанажаў укладваюць вялікую экспрэсіўнасць і глыбокую эмацыянальнасць.

Для стварэння эмацыянальнасці ў п'есах А. Макаёнак і А. Дудараў выкарыстоўваюць верабальныя і невербальныя сродкі.

Невербальныя – міміка, пантаміміка, жэстыкуляцыя і інтанацыя – гэта больш прадуктыўныя сродкі адлюстравання псіхічнага і эмацыянальнага стану чалавека – персанажа, чым вербальныя (лінгвістычныя). Абумоўлена гэта тым фактам, што, на думку псіхолагаў, ад 60% да 80% інфармацыі псіхічнага і эмацыянальнага зместу знаходзіцца ў рухах, жэстах, міміцы і інтанацыі чалавека. А асаблівасць паралінгвістычнай камунікацыі ў тым, што яе праявы неадрыўна звязаны і залежаць ад падсвядомасці кожнага індывіда, таму іх амаль што нельга падрабіць.

Цікавым сродкам паралінгвістыкі, які даволі дакладна ўказвае на эмацыянальнасць гаворачага і які значна дапамагае зразумець сэнс таго ці іншага выказвання, з'яўляецца інтанацыя.

У творах А. Макаёнка і А. Дударава інтанацыя адыгрывае вельмі важную ролю ў стварэнні характараў: гэта своеасаблівы каментарый настрою герояў п'ес. Адносна інтанацыйнага афармлення драматычныя творы маюць сваю адметнасць, прыкладам таму служаць п'есы Макаёнка і Дударава. Гэтыя аўтары не надвяргаюць тэксты адаптацыі да шырокага чытача, а накіроўваюць і ролю знакаў прыпынку (як фармальны паказчык інтанацыі), і свае рэмаркі, у якіх даецца "парада" акцёрам, што будуць увасабляць персанажы на сцэне, на стварэнне канфлікту, абвостранасці жыццёвай сітуацыі і перадачу ўнутранага стану герояў. Рэалізацыя магчымасцей інтанацыі пры стварэнні эмацыянальнасці ажыццяўляецца праз панаванне ў п'есах Макаёнка і Дударава шматкроп'яў, падвоеных і патроеных клічнікаў, клічнікаў з пытальнікамі і г.д. Прычым, калі клічнікі і пытальнікі амаль заўсёды з'яўляліся паказчыкамі такіх псіхічных станаў, як узбуджанасць, радасць (клічнікі) і зацікаўленасць, недавер (пытальнікі), то шматкроп'е набывае ўжо дадатковую функцыю: яно не толькі сімвалізуе незакончанасць думкі, але і адлюстроўвае такія эмоцыі як разгубленасць (*"Я?.. Не... Дык я ж... Але, што табе*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*гаварыць...*") [М., III, 34]; незадаволенасць (*Галавой думаць трэба... Самадзейнасці ёй захацелася...*") [Д., 53]; душэўны ўздым, хваляванне, шчасце, закаханасць (*"Я... Цябе... Люблю я цябе... Даўно ўжо я...*") [Д., 91]

Для больш поўнага раскрыцця характараў і тлумачэння сваёй аўтарскай паэзіі А. Макаёнак і А. Дудараў у сваіх п'есах шырока выкарыстоўваюць рэмаркі з канкрэтным указаннем патрэбнай інтанацыі: расказвае *дрыжачым* голасам, *злосна* бубніць, бубніць сабе *пад нос*, *пяшчотна* шэпча, *здзіўлена* перапытвае, *узрадавана* крычыць, *нярвова і адрывіста* гаворыць, *разгублена* адказвае, *узрушана, ледзь чутна, усхліпваючы, ціха і ўрачыста* і г.д.

А. Макаёнак і А. Дудараў прыкладамі са сваіх твораў даюць магчымасць адчуць важную ролю інтанацыі. Вядома, што сэнс аднаго і таго ж слова ці фразы змяняецца ў залежнасці ад інтанацыі, з якой яны вымаўляюцца. У гэтым можна ўпэўніцца: узяўшы адну фразу і прасачыўшы за варыянтнасцю інтанацыі, з якой яе ўжываюць героі Макаёнка і Дударава:

1.(Пяшчотна) "*...Люблю я цябе...*" [Д., 91]

2.(Здзекліва, дражнячы) "*Люблю, люблю... Як яго можна любіць... сапляка...*" [Д., 97]

3.(Нерашуча) "*Я скажу, толькі вы нічога не гаварыце... Я люблю вас...*" [М., II,119]

Такім чынам, нават нешматлікія прыклады пераканаўча паказваюць, што інтанацыя як невербальны сродак займае значнае месца ў адным радзе з мімікай, пантамімікай і жэстыкуляцыяй у працэсе стварэння і перадачы эмацыянальнага і псіхічнага стану драматычных персанажаў у п'есах А.Макаёнка і А. Дударава.

Літаратура:

1. А. Макаёнак. Збор твораў у пяці тамах. Мн., 1987
2. А. Дудараў. Дыялог. П'есы. Мн., 1989.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ